ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1 мая 1935 г.

1979 г. 20 СНЕЖНЯ ЧАЦВЕР

№ 37 (1263)

Выходзіць раз у тыдзень.

Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## ПАЗЫЎНЫЯ СЕСІІ

### ПЕРАКЛІЧКА ФАКУЛЬТЭТАЎ

#### ГІСТФАК

У інтэрнаце № 1 ствараюцца кансультацыйныя пункты для студэнтаў з замежных краін. За звычайным сталом з шыльдай «Кансультацыйны пункт» будуць несці «вахту» члены савета выдатнікаў і вучэбна-выхаваўчай камісіі. У перыяд падрыхтоўкі да залікаў і экзаменаў можна звярнуцца да іх за тлумачэннем незразумелага матэрыялу.

На факультэце створана камісія, якая праўдзе праверку гатоўнасці да сесіі бібліятэк, ленінскага пакоя ў інтэрнаце, наяўнасці патрэбнай літаратуры.

#### ФПМ

А. В. Самусенка, намеснік дэкана па вучэбнай рабоце:

— У пачатку снежня адбыўся сход выкладчыкаў, якія чытаюць лекцыі на першым курсе. абавязковыя кансультацыі. Абмеркавалі расклад здачы залікаў і экзаменаў. Ён складзены з улікам пажаданняў і магчымасцей студэнтаў. Намі адобрана рашэнне камітэта камсамола факультэта аб падвядзенні вынікаў тыднёвай паспяховасці па бальнай сістэме—адразу бачны справы ў кожнай акадэмічнай групе. Слова — за студэнтамі, усё залежыць ад іх ведаў.

Выявілі асабліва «гарачыя месцы».

Аказалася, што найбольшую патрэбу ў дапамозе адчуваюць студэнты, якія паступілі на вучобу з падрыхтоўчага аддзялення, таму для іх назначаны

#### ФІЗФАК

— Цяжка стаць «рацыяналізатарам» у падрыхтоўцы да сесіі. Метады нашай работы звычайныя, — гаворыць Якаў Шнір, старшыня вучэбна-выхаваўчай камісіі.—Апраўдвае сябе апытванне студэнтаў: які з вывучаемых прадметаў цяжэй здаваць? Аказалася, напрыклад, што цяжкасці адчуваюць студэнты другога курса пры здачы заліку па тэорыі механікі. Звярнуліся за дапамогай да выкладчыкаў. Зараз па гэтай дысцыпліне назначаны дадатковыя кансультацыі, а ў наступным семестры павялічыцца колькасць калёквіумаў.

#### БІЯФАК

12 студзеня адбыўся сход студэнтаў першага курса. На парадку дня — падрыхтоўка да сесіі. Адказныя за акадэмічныя сектары расказалі аб справах у групах, выказалі свае прапановы і заўвагі.

Алена Лук'яновіч, студэнтка 4-й групы:

— Многім студэнтам нашай групы не хапае ўмення самастойна рыхтавацца, канспектаваць, правільна размяркоўваць свой час. І крыўдна тое, што не адчуваем дапамогі з боку студэнтаў старэйшых курсаў. А яны маглі б нам расказаць аб самастойнай падрыхтоўцы, арганізаваць экскурсію на кафедры, сустрэчу з выкладчыкамі. Думаем самі арганізаваць сустрэчу з выпускніцай біяфака, ленінскім стыпендыятам. Карысна будзе паслухаць чалавека, які выдатна вучыцца і займаецца грамадскай работай.

Б. ЯЎСЕЙЧЫК,
І. МІХАЙЛОЎСКАЯ.

(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).

## ЧАС НЯЎМОЛЬНЫ...

ФОТАРЭПАРТАЖ



ЗІМА І СЕСІЯ прыйшлі амаль аднвачасова. Толькі, мабыць, студэнты чакалі больш першай, і неспадзяваным было ўжо сёння здаваць залікі. Час не церпіць. Ён няўмольны. Больш заклапочанымі і засяроджанымі сталі студэнты цяпер. Адным словам—сесія...

— Не, гэта яшчэ не сесія, — з упэўненасцю канстатаваў вядомы журфакаўскі паэт.

— Чаму ж?

— Яшчэ ў чыталках ёсць вольныя месцы. Вось калі не будзе магчымасці ўбіцца сюды — тады толькі сапраўдная сесія пачнецца. А цяпер — так, рэпетыцыя...

Сапраўды, сесія заліковая

(Заканчэнне на 3-й стар.)



## НАВІНЫ БДУ

### ЗАДАЧЫ І ПРАБЛЕМЫ

завочнага факультэта, пытанні работы са студэнтамі-завочнікамі былі абмеркаваны на чарговым пасяджэнні савета Беларускага дзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

### КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ

на сучасным этапе — важны фронт барацьбы за камунізм. Гэта тэма была вядучай на навукова-практычнай канферэнцыі бібліятэчных работнікаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Беларусі, якая адбылася ва універсітэце. З дакладамі «Ідэалагічная барацьба двух сістэм на сучасным этапе», «Комплексны падыход да выхаваўчай работы ў ВНУ», «Прапаганда беларускай Ленініяны ў бібліятэках» выступілі прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце В. Г. Ціхіня, галоўны рэдактар часопіса «Веснік БДУ» М. Д. Ціва, загадчыца аддзела беларускай літаратуры Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна Р. М. Чыгірова. У канферэнцыі прыняў удзел старшы метадыст навукова-метадычнага аддзела Мінвуза БССР Р. І. Пархомаў.

### ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ КЛУБ

«Палітыкус» створаны два гады назад. З першых жа дзён існавання клуба студэнты зацікавіліся яго дзейнасцю. Асноўны напрамак работы клуба заключаецца ў тым, каб шляхам абмеркавання актуальных міжнародных праблем даць замежным студэнтам марксісцка-ленінскае разуменне сучаснасці. «Палітыкус» быў створаны па прыкладу і на аснове вялікага вопыту інтэрнацыянальнай работы ва універсітэце Дружбы народаў імя П. Лумумбы. У цяперашні час у састаў клуба ўваходзяць прадстаўнікі 16 краін. Кіраўніцтва здзяйсняе савет, у які ўваходзяць пяць студэнтаў. Старшынямі «Палітыкуса» з'яўляюцца І. Велічанскі — студэнт V курса гістфака і Амаду Лі — студэнт з Гвінеі (журфак, II курс). Пасяджэнні клуба праходзяць раз у два тыдні. На іх абмяркоўваюцца пытанні міжнароднай палітыкі і іншыя актуальныя праблемы, якія цікавяць студэнтаў. Чарговая тэма пасяджэння, дзе будуць выступаць студэнты з Аргенціны, Калумбіі, Балівіі, Сальвадора і Панамы, называецца «Армія і рэвалюцыйны працэс у Лацінскай Амерыцы».

### ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

адбылася нядаўна ў інтэрнаце № 2 з уласным карэспандэнтам «Комсомольской правды» Э. П. Луканскай. Вопытны журналіст змястоўна расказала аб сваёй рабоце, аб тых праблемах, якія зараз хвалююць газету, падзялілася сваімі творчымі планамі, адказала на пытанні прысутных.

### СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ

развіцця аўтаматызаваных навучаючых сістэм на базе ЭВМ — на гэтым была сканцэнтравана асноўная ўвага прысутных на міжвузаўскім навуковым семінары, які днямі быў праведзены ва універсітэце.

ПОД ОСТРЫМ УГЛОМ

# ЭТОТ ДОЛГИЙ, ДОЛГИЙ ПУТЬ

ТАК ОХАРАКТЕРИЗОВАЛИ народные контролеры работу Минского филиала Всесоюзного научно-исследовательского и проектно-конструкторского института механизированного и ручного строительно-монтажного инструмента, вибраторов и строительно-отделочных машин по улучшению качества разработок и скорейшему внедрению их в производство. И это действительно так.

В институте проводится еще недостаточная работа по высвобождению ручного труда в строительстве. Не все охраноспособные разрабатываемые темы защищаются авторскими свидетельствами. Из 17 тем, законченных в 1976 году, защищено авторскими свидетельствами только 2, в 1977 году из 17—5, в 1978 году из 12—6, в 1979 году из 5—3, т. е. только каждая третья тема за четыре года защищена авторским свидетельством. Несмотря на увеличение процента выдачи положительных решений количество поданных заявок на изобретения в 1978 году по сравнению с 1976 годом сократилось на 20 процентов. Отдельные изобретения филиала не решают принципиальных вопросов и не используются в конструкциях машин и механизмов. Из 16 принятых изобретений заложено в конструкции строительных машин — 13.

Не на должном уровне находится работа партийной организации и руководства института по внедрению научно-исследовательских разработок в производство. Сроки внедрения новых машин по механизации строительных работ составляют в ряде случаев 4—5 лет. Так, техническое задание на машины по укладке кровли было закончено в 1977 году, а работы по проектированию машины включены в планы 1980 года.

По отдельным темам имеются разрывы между окончанием научно-исследовательских разработок и опытно-конструкторских работ до 1—2 лет.

Научная разработка темы «Комплект машин и механизмов для устройства полов из керамической плитки» стоимостью 100 тысяч рублей завершена в 1978 году, а опытно-конструкторские работы намечены только на 1980 год.

Отдельные машины и механизмы, изготовленные по разработкам института, имеют низкий технический уровень. Так, по замечаниям строительных организаций Минпромстроя БССР снята с промышленного производства из-за конструктивных недоработок машина для раскатки и прокладки рулонных материалов. На разработку темы, изготовление опытных образцов использовано около 26 тысяч рублей.

Указанные недостатки стали предметом серьезного разговора на бюро райкома партии. Надо думать, что руководство института сделает из этого соответствующие выводы и примет неотложные меры по устранению этих упущений.

**В. ЛАРЮТИН,**
**заведующий внештатным отделом науки, культуры и народного образования РК НК.**

# НК СТРАНИЦА №2 КОМИТЕТА НАРОДНОГО КОНТРОЛЯ МОСКОВСКОГО РАЙОНА

● САТИРИЧЕСКИМ ПЕРОМ

## Кто кого перещеголял

Ох уж это хвастовство! Ох уж это бахвальство! Недаром утверждают, что оно беспредельно в оценке собственных способностей и талантов и достигает глобальных размеров в трактовке достижений на поприще трудовой деятельности.

Поговаривают, что нужно учредить специальный клуб хвастунов под девизом: «Кто кого перещеголяет». Даже есть уже проекты деления на секции. Одни будут хвастаться своими успехами, другие —недоработками, просчетами, упущениями и т. д. и т. п. Второй секции, как нельзя лучше, подошел бы лозунг «Достижения наоборот».

Если этим проектам суждено сбыться, то право открыть заседание второй секции нужно непременно предоставить директору фабрики № 2 Ю. П. Логинову, директору завода электромонтажных изделий треста «Белэлектромонтаж» Н. И. Сипейко и исполняющему обязанности директора бильярдной фабрики «Динамо» И. Ю. Рыбалко. Почему? Да по той простой причине, что эти многоуважаемые товарищи уже провели генеральную репетицию начала заседания. И, с их точки зрения, весьма удачную. Они обсуждали свои «достижения наоборот» по весьма актуальному вопросу: «О подготовке к работе в зимних условиях и использовании топливно-энергетических ресурсов».

Как видите, эти руководители довольно оперативно реагируют на смену листков календаря и веяния поднимаемых проблем.

Начал разговор т. Логинов:

— У меня план мероприятий по подготовке к зимнему сезону составлен. И давно. Но система резервного топливоснабжения отсутствует. В котельной предприятия нет ни резервного топлива, ни устройства для его сжигания. Вот это — мой главный козырь.

— Нашел чем хвастаться,— перебил его т. Сипейко. — У меня круглый год из-за плохой изоляции теплотрасса дарит калории окружающей среде. К тому же, план организационно-технических мероприятий в части экономии электроэнергии выполняю с отставанием.

— Погодите, товарищи! Все ваши деяния — просто семечки, — вмешался в разговор т. Рыбалко. Послушайте меня. Во-первых, длительное время не устанавливаются имеющиеся в наличии статические конденсаторы для компенсации реактивной мощности. В результате только за этот год фабрика уплатила 1300 рублей штрафа. Из-за запыленности светильников и загрязненности окон нерационально используется электроэнергия на освещение.

Во-вторых...

Но тут руководители стали говорить хором, хвастаясь своими «достижениями наоборот». Один твердил, что у него отсутствуют ответственные за включение и выключение освещения. И только на этом было потеряно свыше 2 тысяч квт-часов электроэнергии. У другого отсутствовал контроль за расходованием горюче-смазочных материалов и работой автотранспорта. У третьего...

Ох уж это хвастовство! Ох уж это бахвальство! До добра оно редко кого доводило. И на этот раз не осталось незамеченным. На вышеупомянутые предприятия заглянули народные контролеры. Все тщательно проверили и пришли к выводу, что руководители «хвастались честно»: ничего не прибавили.

А за искренние стремления стать основателями нового клуба «поощрены» районным комитетом НК. Кто выговором, кто предупреждением. В полном соответствии со своими деяниями.

**В. ИГНАТОВ.**



**Идет заседание группы народного контроля университета по результатам проверки подготовки учебных корпусов и общежитий к зиме.**

● ОБОБЩАЕМ ОПЫТ

## ДЕЙСТВЕННОСТЬ РУКОВОДСТВА

Головная группа народного контроля треста «Оргтехстрой», выполняя постановление комитета народного контроля СССР «О некоторых вопросах работы комитетов народного контроля по развитию инициативы и повышению активности народных контролеров», под руководством партийной организации стала более активной, а проверки—более эффективными.

16 членов головной группы, возглавляемые заместителем секретаря партбюро П. П. Гилем, проявляют творческую инициативу, находчивость, стремление к совершенствованию форм и методов контрольной работы. Здесь каждый народный контролер имеет постоянное конкретное поручение по тому или иному участку работы.

Группа составляет годовые перспективные и квартальные планы работы. В их разработке участвуют все руководители секторов. Планами предусматриваются актуальные проверки производственной и хозяйственной деятельности подразделений и служб треста —внедрение в производство новой техники и технологии, экономия материальных ценностей, электрической и тепловой энергии, прохождение заявлений и жалоб.

Председатель группы НК П. П. Гиль уделяет большое внимание подготовке проверок. Совместно с соответствующим руководителем сектора подбирает состав комиссии, разрабатывает памятку или план проверки, проводит инструктирование участников проверки. В нужных случаях знакомит членов комиссии с положениями или инструкциями, регламентирующих деятельность той или иной службы.

С обсуждаемыми материалами и принятыми рекомендациями или предложениями П. П. Гиль знакомит членов коллектива. Для этого он использует проводимые массовые мероприятия — производственные собрания и совещания, планерки, собрания партийной и профсоюзной организаций. Наиболее характерные материалы находят отражение на стенде группы и в стенной печати.

Об авторитете группы народного контроля говорит и такой факт. В апреле 1978 года некоторые сотрудники аппарата треста обратились к председателю группы с просьбой установить причины нарушения положения о премировании за внедрение новой техники. При проверке нарушение действительно было установлено. Приказ по предложению народных контролеров был переиздан, лица, представившие неверные данные для приказа, наказаны. Сотрудники, заслужившие поощрение, были включены в приказ.

Группа народного контроля треста осуществляет постоянный контроль за выполнением внесенных рекомендаций и предложений, добивается доведения каждого начатого дела до конца.

Умелое руководство со стороны партийной организации группой народного контроля позволяет достичь весомых результатов в деятельности народных контролеров.

**И. РУБЕНЧУК,**
**заведующий внештатным отделом организационной работы РК НК.**

УЧЕБА

## Школа рабочего контроля

ЦЕХ № 2 на фабрике им. Куйбышева — одно из лучших подразделений. Активно работает и группа НК, которую возглавляет Галина Васильевна Свиридович, бывшая выпускница ГПТУ-32, ныне пошивщица. В составе группы — люди с большим профессиональным опытом: Л. Т. Мурашко, технолог цеха, В. А. Михолап, начальник смены, работающая более 20 лет на фабрике, а также молодой специалист, окончившая 4 года назад техникум легкой промышленности, ныне мастер выпуска ученических сумок М. А. Данько.

Группа НК регулярно раз в месяц проводит учебу всех четырех постов НК цеха. По утвержденной программе каждая тема закреплена за отдельным пропагандистом. Недавно проводились занятия по теме: «Формы и средства гласности народного контроля». Явка на занятия — полная. Пропагандист хорошо владеет материалом, методически верно, в доступной форме его подает, связывает вопросы теории с конкретной практикой на фабрике. За каждым приводимым ленинским положением о гласности работы органов народного контроля следуют факты, подтверждающие конкретность работы. Живой контакт слушателей с руководителем занятий показывает заинтересованность в деле совершенствования их работы. Затем от изложения общих теоретических вопросов занятия переходят к обсуждению практики работы народного контроля в цехе. Выступает коммунист, член группы НК Л. Т. Мурашко. Называет формы и средства гласности в цехе. Основная задача — дойти до сознания каждого рабочего, разобраться в каждом конкретном случае. На посту НК их участка висит план работы, в котором указано, кто за что отвечает. Все сигналы (станок ли не используется или где-то течет вода, некачественная ли деталь и т. д.) обсуждаются сразу в перерыве или после смены, каждый вопрос доводится до конца.

Мария Антоновна Данько дополняет рассказ своих товарищей о формах и средствах гласности. Возглавляющая группу НК в цехе Галина Васильевна Свиридович охарактеризовала работу всех четырех постов НК цеха, подчеркнув, что люди в них принципиальные, требовательные. Подводя итоги, Галина Васильевна сделала выводы, которые войдут в ее последующий план работы. Как, например, вывешивать за неделю список вопросов для занятий, работать с «золотой серединой», т. е. с теми, кто не числится ни в передовиках, ни в отстающих, отмечать тех, кто впервые, хоть на 0,1 процента, перевыполнил план, иметь перечень тех недостатков, с которыми борются в цехе...

Учеба в школе НК способствует заинтересованности людей в труде, расширяет границы теоретического осмысления вопросов практики, экономики производства.

**Г. ШЕЛЮБСКАЯ,**
**внештатный инспектор РК НК.**

РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ

# Трыццаць год запар

У ВАЙШОЎШЫ ў стэрэатыпны цэх друкарні БДУ імя У. І. Леніна, я адразу адчуў рэзкі пах пароў свінцу. Расплаўлены метал запаўняў чыгунныя формы.

— Што, не падабаецца наша паветра? — адгадаў мае думкі стэрэатыпёр У. М. Гарбачоў.— Новаму чалавеку тут заўсёды непрывычна, а я ўжо нават не заўважаю...

Ён надзеў спяцоўку, лёгкім рухам прыўзняў форму з застылым металам і стукнуў ёю аб жалезную падлогу. З сінаватым дымам выслізнула свінцовая загатоўка.

— Дайце мне паспрабаваць, — не вытрымаў я, зацікаўлены гэтым, на першы погляд, лёгкім працэсам.

— Давай... — ветліва ўсміхнуўся Уладзімір Міхайлавіч.

— Я моцна рвануў форму і ледзь не ўпусціў яе сабе на ногі.

— Нічога, — супакоіў Уладзімір Міхайлавіч, — гэта з непрывычкі... Я больш за трыццаць год у друкарні працую, таму і атрымліваецца добра.

— Трыццаць год! Колькі ж вам было, калі толькі пачыналі?

— Пятнаццаць...— задуменна адказаў Уладзімір Міхайлавіч і замаўчаў.

Відаць, маё пытанне навеяла ўспаміны. Гэты сціплы чалавек мог некалькі гадзін запар расказваць пра сваю работу, але аб сабе асабіста гаварыў вельмі мала і неахвотна.

Маці Уладзіміра Міхайлавіча памерла яшчэ да вайны, а бацька ў сорак першым загінуў на фронце. Гадаваўся хлопчык у цёткі. Прыйшлося рана зарабляць на кавалак хлеба.

Пачалося ўсё з таго, што недалёка ад цётчынага дома размясцілася друкарня. Наборшчыкі заўважылі хударлявага падлетка, які кожны дзень сачыў за імі праз акно. Друкарні патрэбны былі людзі. Так хлопец і апынуўся сярод рабочых.

— Хутка першакласнага майстра з цябе зробім, — жартавалі мужчыны. І не памыліліся. Ужо праз два гады ён працаваў наборшчыкам на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная Зорка».

Адзінаццаць гадоў назад ад яе выдзелілася друкарня БДУ. Тут і застаўся Уладзімір Міхайлавіч.

— Відаць, сэрцам прыраслі вы да гэтай прафесіі? — запытаў я.

— Можа і так, — згадзіўся ён. — Праўда, я выплаўляю стэрэатыпы. Вочы ўжо не тыя, каб наборшчыкам працаваць. У лістападзе пяцьдзесят стукнула, хутка і на пенсію пара.

— А хто ж замест вас застанецца?

— Замест мяне? Ды не, я на сваім месцы і застануся. Нічога, што ўзрост немалы. Што мне дома рабіць?! Мабыць, і заснуць цяжка будзе, свінцу не панюхаўшы.

— Уладзімір Міхайлавіч, што б вы пажадалі маладому стэрэатыпёру, які яшчэ толькі пачынае свой працоўны шлях?

— Любіць сваю працу...

Гэтае пажаданне выказана так шчыра і так проста!

Таварышы па рабоце ведаюць Уладзіміра Міхайлавіча Гарбачова не толькі як умелага майстра, чалавека з добрай душой, але і як вернага сябра, гатовага ў любую хвіліну прыйсці на дапамогу.

— Аднойчы нашы рабочыя паехалі на экскурсію ў Талін,— успамінае дырэктар друкарні М. Н. Шкурдзюк. — Здарылася так, што ў гасцініцах не было свабодных месц. Уладзімір Міхайлавіч аб'ездзіў увесь горад, пакуль не знайшоў начлег для дванаццаці чалавек...

Хочацца шчыра падзякаваць яму за працавітасць, за тую цеплыню, з якой ён выконвае сваю работу.

**Ул. ДАШУК,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

# ЗВЫЧАЙНАЯ СУБОТА

**РЭПАРТАЖ З ІНТЭРНАТА № 2 ВЯДЗЕ НАШ СПЕЦЫЯЛЬНЫ КАРЭСПАНДЭНТ С. ЛЫСКАВЕЦ**

19-00. Паверх першы. Паверх галоўны. Бесперапынна грукаюць дзверы. Ля прахадной сабраўся натоўп. Чырвоныя ад марозу твары. Мокрыя ад снегу паліто і шубы. Торты, пакункі, сеткі і сумкі. Бабуля-вахцёр ля рэфлектара грозна папярэджвае: «Без пропуску ні-ні». Натоўп разумее. Парадак ёсць парадак.

19-10. Адзін не вытрымаў. Адважыўся пралезці. Без дазволу. Спрытны. Кінуліся лавіць. Дарэмна. Уцёк. Натоўп дружна ўздыхнуў. Нічога не зробіш. Здараецца і такое.

19-30. Ля тэлефонаў-аўтаматаў чарга. Тры-чатыры чалавекі. Усе цярпліва чакаюць. Хтосьці шукае грошы. Прыйшлося пазычаць. Больш няма.

19-45. «Мамачка! Здала, чуеш, здa-a-ла!» Дзяўчына ў шэрым світэры ледзь не падскоквае ад радасці. «Малайчына»,— адказвае ёй апошні ў чарзе хлопец у велізарных акулярах і паказвае на гадзіннік. «Колькі ж можна размаўляць?».

20-00. Прыйшлі дружыннікі. Ва ўсіх чырвоныя павязкі. У аднаго бачу канспект. Астатнія слухаюць прыёмнік. «Пінк флойд». Апошні альбом. Цікава.

20-10. З ліфцёрскай чуецца лаянка: «Зноў ліфт не працуе! Колькі можна! На трынаццаты пешшу?» Сапраўды, цяжка. Асабліва дзяўчатам.

20-20. Займаюся арыфметыкай. Увайшло ў інтэрнат дваццаць шэсць. Выйшла чатырнаццаць чалавек. І ўсё гэта за некалькі хвілін. Шмат! А заўтра, напэўна, будзе яшчэ больш.

20-30. Прaнесліся чуткі, што сёння ў інтэрнаце «агеньчык». Толькі вось у каго і дзе, не ведаю. Ды і навошта. Трэба ісці.

22-00. Пяты паверх. У калідоры пахне фарбай. Нядаўна адрамантавалі. Хутка перакінуцца на чацвёрты. Няўжо ў час сесіі?

22-30. Сёмы паверх. Насустрач ідзе хлапец з патэльняй. На ёй штосьці скварыцца. Прыглядаюся. Яечня. Смаката!

23-00. Паверх дзевяты. Царства мехмата. Дзве дзяўчыны ўважліва чытаюць канспекты. Дзяжурныя. Падыходжу. Так і ёсць. Формулы, графікі і формулы. Жартую: «Навошта?» Усміхаюцца: «Хутка залік».

23-30. Дзесяты паверх. Ля ліфцёрскай весела. Гучаць песні. Ала Пугачова, Уладзімір Высоцкі, «Смокі» і шмат іншага. Не буду перашкаджаць.

00-00. Поўнач. Бібікае радыё. Пачынаецца новы дзень.

00-10. Адзінаццаты паверх. «Агеньчык». Цікаўлюся, якая праграма. Здзіўляюцца: «Звычайная». Усё ясна — танцы.

00-30. На дванаццатым і трынаццатым нічога цікавага. Пуста і цёмна. Лепей спусціцца. На пяты. Там танцы.

1-00. Я на пятым. Танцы ў разгары. Штурханіна. Таўкатня. Свабодных месц няма і не прадбачыцца. Чакаю, пакуль хто-небудзь выйдзе. Дачакаўся. Кідаюся ў цэнтр. Добра. Толькі згубіў гузік. Нічога, потым знайду.

1-10. Хтосьці моцна штурхае мяне ў плячо, ды некалькі разоў абтаптвае ногі. Выходжу...

1-30. Яшчэ раз праходжу па ўсіх паверхах. Нічога незвычайнага. Толькі здаецца, што сённяшняя «звычайная» субота можа быць апошняй. Бо хутка сесія. Хутка экзамены.

**Ад рэдакцыі.**

Пытанне студсавету інтэрната № 2: ці не здаецца вам, паважаныя таварышы, што адпачынак студэнтаў заслугоўвае большай увагі і спланаванасці?

Пытанне каменданту інтэрната № 2: ліфты існуюць для таго, каб імі карысталіся. Ці ў вас іншая думка?

Чакаем тэрміновага адказу.

# ЧАС НЯЎМОЛЬНЫ...

ФОТАРЭПАРТАЖ



здаецца лягчэйшай намнога, чым экзаменацыйная.

Але, пабываўшы на некаторых заліках, я зразумеў, што з паэтам можна спрачацца.

Студэнты юрфака ўжо звыкліся з новымі сценамі і спрабуюць здаваць першыя залікі. Упершыню сустракаюцца з сесіяй першакурснікі завочнага факультэта. Прадмет цікавы,

Пра першы курс і гаворкі няма. Залік здаюць і старымі (праверанымі), і новымі (эксперыментальнымі) спосабамі.

Задаволены трэцякурснікі. Залік па замежнай літаратуры здалі па добра. Аб гэтым і пісаць не трэба, глянуць толькі на вясёлыя твары старастаў другой і трэцяй груп Валодзі Прачуханава і Валодзі Шыка.

З паэтам сустрэўся зноў праз два дні. Пагаварыць не





але і даволі каверзны — асновы рымскага грамадзянскага права. В. Крайко паспяхова справіўся з выпрабаваннем.

А журфак падобны на устрывожаны вулей. Хаця і імкнуцца старшакурснікі трымаць бравы, незалежны выгляд, усё ж хваляванне прыкметнае.

ўдалося. Як метэор, праляцеў па калідоры.

— Няма часу. Залік... Сесія...

Зазірнуў у чытальку. Сапраўды, месцы вольныя яшчэ былі. Успомніў паэта.

І ўсё ж... Сесія пачалася...

**М. ДУБОВІК.**
Фота аўтара.

● КАЛЕКТЫЎ: ПРАБЛЕМЫ СТАНАЎЛЕННЯ

# ГРУПА ЯК ГРУПА...

ГАВОРАЦЬ, што студэнцкія гады — самыя цікавыя, самыя вясёлыя і самыя памятныя ў жыцці. Магчыма, так яно і ёсць на самай справе — цяжка забыць пяць гадоў, праведзеных разам, у адным калектыве. І асабліва калі гэты калектыў па-сапраўднаму зладжаны, дружны.

Па выніках апошняй сесіі наша 2-я група другога курса заняла першае месца па паспяховасці на факультэце журналістыкі. Магчыма, таму, што вучыліся студэнты пастаянна, на працягу семестра, а не толькі перад сесіяй. Але не вельмі ганарацца юнакі і дзяўчаты поспехамі. «Група як група», — звычайна гавораць яны.

Не раз даводзілася мне бачыць такое. Напярэдадні экзамена, заліку або проста практычных занятках у некаторых студэнтаў узнікалі цяжкасці, незразумелыя пытанні. Вядома, у такі час звяртаешся за дапамогай да сяброў. Хоць час і вельмі напружаны, але ніхто ніколі не адмаўляе ў дапамозе. Наадварот, заўсёды дапамагалі адзін аднаму, усе незразумелыя пытанні вырашалі разам. І вось вынік: летнюю сесію група здала без адзінай незадавальняючай адзнакі. Усе студэнты, за выключэннем двух, атрымалі стыпендыю. Праўда, і выдатнікаў не так ужо многа — усяго два (у групе 24 чалавекі).

Вядома, што актыўнасць, згуртаванасць калектыву ў многім залежаць ад яго актыву. У нас гэта — староста групы Галя Міхнавец, камсорг Валера Мароз і прафорг Галя Сачанка. Ці то жартам, ці то ўсур'ёз студэнты групы сцвярджаюць, што іх актыў, як ядро атама: заўсёды знаходзіцца ў цэнтры жыцця. Дзякуючы ім і вучоба ідзе добра, і адпачынак праводзіцца карысна і цікава. На практычных занятках студэнты не толькі адказваюць на зададзеныя пытанні, але ставяць свае праблемы, у спрэчках знаходзяць ісціну. А ў вольны час — разам у музей, тэатры, на стадыёны... Ды гэтым, напэўна, нікога не здзівіш. Цікава тое, што на наступны дзень свабоднымі думкамі, меркаваннямі аб убачаным, прачытаным яны ахвотна дзеляцца са студэнтамі іншых груп. А праз некалькі дзён ужо чуеш, што студэнты 1-й групы, напрыклад, абмяркоўваюць той жа спектакль, кнігу. Бывае і наадварот.

Наогул, я лічу сваю групу дружнай. Праяўленне гэтай дружбы можна заўважыць усюды і кожны дзень. Вось, напрыклад, Лена Сухоцкая, якая гатова дапамагчы кожнаму, хто да яе звернецца. Валодзя Цяцернік чытае новыя вершы, Саша Халецкі дзеліцца жыццёвымі клопатамі...

Праўда, не ўсё яшчэ ў групе наладжана так, як хацелася б. Ёсць у нас свае спартсмены, але стопрацэнтнага захаплення спортам няма, што і пацвердзілася на асеннім кросе. Ёсць у нас свае самадзейныя артысты, але ўбачыць іх на факультэцкай сцэне можна не вельмі часта. Не хапае яшчэ нам актыўнасці, асабістай ініцыятывы, своеасаблівай смеласці для таго, каб паказаць сваё «я». Над гэтымі праблемамі і думаюць цяпер студэнты. І думае, рашае не толькі актыў, але і ўсе юнакі і дзяўчаты. А гэта значыць, што ў хуткім часе гэтыя праблемы вырашацца ў канкрэтных справах, у дзеянні.

**В. САБАЛЕЎСКІ,**
**студэнт II курса факультэта журналістыкі.**

# ПЕСНІ БАРАЦЬБЫ

ВОСЬ ужо некалькі год запар на фізічным факультэце праходзяць традыцыйныя конкурсы палітычнай песні. І гэта зразумела, таму што палітычная песня з'яўляецца моцнай зброяй супраць ворагаў разрадкі. Песня барацьбы гучыць пальмяна і з заклікам на ўсіх мовах свету.

Нядаўна зноў гучалі песні свабоды, песні барацьбітоў за незалежнасць усіх прыгнечаных народаў Зямлі. З вялікай ахвотай студэнты ўдзельнічалі ў гэтым конкурсе.

Цёплы прыём шматлікіх гледачоў, атмасфера, якая панавала ў зале, — усё дапамагала ўдзельнікам лепш раскрыць свае магчымасці.

Выступленне ацэньвала кампетэнтнае журы, у састаў якога ўваходзілі лаўрэаты конкурсаў мінулых год А. Цімошчанка і І. Рудкоўскі, а таксама А. Грубіч, В. Аджаеў, Т. Ключановіч, Т. Калодзежная.

Песня «Яблынька» ў выкананні студэнткі першага курса І. Рыбачонак пачала тэму вернасці нашага пакалення памяці загінуўшых, вернасці інтэрнацыянальнаму доўгу, Радзіме. Яна прагучала і ў іншых песнях, якія выконваліся студэнтамі: «Пунсовыя макі» (група студэнтаў ІІ курса), «Песня аб Віктары Хара» (А. Аўяр'янава, ІІІ курс), «Равеснікаў сляды» (Г. Гозман, IV курс і Н. Рыгько, ІІІ курс), «Малююць хлопчыкі вайну» (А. Захараў, V курс), «Голас Пабла Неруды» (група студэнтаў ІІ курса). Нам зразумела боль чылійскай зямлі, зразумела імкненне народа Радзэзіі да свабоды, яго барацьба супраць апартэіду, таму так глыбока запалі у душу гнеўныя словы песень пратэсту.

Кульмінацыйным момантам конкурсу з'явілася песня «Калі мы адзіны — мы непераможны» ў выкананні студэнтаў IV і V курсаў А. Захарава, Г. Макеева і Г. Рацюхіна.

Хочацца сказаць некалькі слоў аб пераможцах. Першае месца было прысуджана трыо ў саставе А. Пухальскай, І. Пасненкавай, А. Хрыстафоравай. Дзяўчаты даўно знаёмы гледачам. У мінулым годзе яны сталі лаўрэатамі на конкурсе палітычнай песні БДУ. Трыо любяць на факультэце за эмацыянальнасць і шчырасць выканання як лірычных песень, так і твораў грамадзянскага гучання. Другое месца занялі студэнты IV і V курсаў А. Захараў, Г. Макееў, Г. Рацюхін. Трэцяе месца падзялілі І. Філатаў (ІІІ курс) і С. Сяргейчык (ІІІ курс).

Сярод ансамбляў першае месца заняла група студэнтаў ІІ курса. У заключэнне адбылся канцэрт лаўрэатаў. Наперадзе новая сустрэча — агляд палітычнай песні БДУ, на якім выступяць пераможцы гэтага конкурсу.

**С. КРАЎЦОЎ,**
**студэнт ІІІ курса фізічнага факультэта.**



**На здымку:** пераможцы конкурсу палітычнай песні **І. Пасненкава, Л. Хрыстафорава, Л. Пухальская.**

Фота **У. Курылы.**

## ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

«ПАРА БІЦЬ ТРЫВОГУ» — так называўся артыкул, які быў змешчаны 29 лістапада 1979 года. У ім падвяргалася вострай крытыцы работа сталовых (у інтэрнаце № 5, галоўным корпусе, НДІ ПФП). Рэдакцыя атрымала пісьмо за подпісам загадчыцы сталовай № 33 В. Куліковай. У ім паведамляецца, што «артыкул «Пара біць трывогу» абмеркаваны ў калектыве. Робяцца захады, каб палепшыць работу грамадскіх сталовых».

# ПРАФСАЮЗНЫ ТЭЛЕТАЙП

АДБЫЛОСЯ пасяджэнне прэзідыума прафкома універсітэта. На абмеркаванне былі вынесены два пытанні: зацвярджэнне плана работы прафкома на 1980 год; вынікі справаздачна-выбарнай кампаніі ў прафсаюзнай арганізацыі.

Старшыня прэзідыума прафкома М. М. Дрозд азнаёміў прысутных з планам работы на 1980 год, з планамі работы прафбюро факультэтаў. Сярод лепшых адзначаны планы работы юрыдычнага і механіка-матэматычнага факультэтаў. А. М. Чыкілеў — намеснік старшыні па арганізацыйна-масавай рабоце — прааналізаваў вынікі справаздач і выбараў у прафсаюзных факультэцкіх арганізацыях. На належным узроўні яны прайшлі на факультэтах журналістыкі, механіка-матэматычным і прыкладной матэматыкі.

На пасяджэнні падведзены вынікі агляду-конкурсу на лепшую прафсаюзную арганізацыю універсітэта і лепшы студэнцкі інтэрнат за 1979 год. Сярод факультэтаў лепшымі прызнаны адпаведна—гістарычны, факультэты прыкладной матэматыкі, радыёфізікі і электронікі, хімічны, а сярод інтэрнатаў — №№ 1, 8, 4.

* * *

Аб новым плане работы і размеркаванні абавязкаў ішла размова на пасяджэнні праўлення клуба мастацкай самадзейнасці БДУ. Старшынёй праўлення выбрана Л. П. Лазарава, яе намеснікам — студэнт філалагічнага факультэта П. Адамовіч.

Ад кожнага факультэта ў састаў праўлення ўваходзіць па два прадстаўнікі.

**М. ЛАХВІЧ.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

# «САЛОДКІ» КОНКУРС

У АДНОЙ з аўдыторый гістарычнага факультэта доўга не гасла святло. Гучала музыка, танцавалі пары... Пяцьдзесят студэнтаў ІІІ курса аддзялення гісторыі прыйшлі на вечар з незвычайнай назвай «Ласун». А называўся ён так таму, што на вечары праводзіўся конкурс на лепшы кандытарскі выраб. Амаль на прафесійным узроўні дзяўчатамі факультэта былі падрыхтаваны стравы, якія знаходзіліся на сталах.

Дэгустацыйная камісія, у састаў якой уваходзілі А. Раджыскoвіч, Б. Баннікаў, Л. Горгуль, павінна была вызначыць лепшы выраб як па смаку, форме, так і па назве.

...І вось пераможцы вызначаны. Імі сталі А. Саракoвіч і І. Сухнат.

...Хутка праляцяць гады студэнцкага жыцця, але яркія эпізоды яго назаўсёды застануцца ў нашай памяці.

**А. РЭЗНІК,**
**студэнт ІІІ курса гістарычнага факультэта.**

## ДЗЕНЬ ДОНАРА

Камітэт Таварыства Чырвонага Крыжа, камітэт камсамола, прафком заклікаюць усіх студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў БДУ імя У. І. Леніна прыняць удзел у бясплатнай здачы крыві для лекавых мэт.

Паважаныя таварышы! Чакаем вас на донарскім пункце паліклінічнага аддзялення БДУ 24 снежня з 10 да 14 гадзін.

**КАМІТЭТ ТАВАРЫСТВА ЧЫРВОНАГА КРЫЖА, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА, ПРАФКОМ.**

**ДА МІЖНАРОДНАГА ГОДА ДЗІЦЯЦІ**



# БУДУЧАЕ ПЛАНЕТЫ

ЭМБЛЕМУ гэтага года ведае кожны — дзіця падняло ўверх рукі, каб злавіць мячык. Яго аберагаюць яшчэ адны рукі — вялікія і моцныя — рукі дарослага. Гульня—справа дзяцінства. Але каб дзеці маглі спакойна гуляць у свае гульні, дарослыя павінны стварыць ім для гэтага ўсе ўмовы.

Дзіця працягнула рукі да мяча. Магчыма, гэта і не мяч. Магчыма, мастак хацеў сказаць сваім малюнкам, што шар над дзіцем — гэта планета людзей, якую таксама трэба берагчы і абараняць ад усяго злога і чорнага, што можа азмрочваць дзяцінства. Бо яно — будучае планеты.

Колькі дзяцей на Зямлі? Па даных Міжнароднай арганізацыі працы ў 1979 годзе дзеці складаюць 35 працэнтаў усяго чалавецтва, ці, прыкладна, 1600 млн. чалавек. Трое з кожных пяці дзяцей свету жывуць у Азіі, 13 працэнтаў — у Афрыцы, 10 працэнтаў — у Лацінскай Амерыцы, 7 працэнтаў — у Еўропе, 4 працэнты — у Паўночнай Амерыцы. Дзіцячае насельніцтва СССР складае 4 працэнты ўсіх дзяцей планеты.

Лёс дзяцей непарыўна звязаны з лёсам іх народаў. Іх сённяшняе жыццё, іх будучае залежаць ад таго, у якіх сацыяльна-эканамічных умовах яны растуць і развіваюцца.

Дзеці XX стагоддзя. Вучоныя праніклі ў тайны генетыкі, навучыліся расшчапляць атамнае ядро, ратаваць мільёны людзей ад смяротна небяспечных хвароб. Чалавек актыўна асвойвае космас. Каму, як не дзецям, карыстацца вялікімі дасягненнямі стагоддзя. Але дасягненні навукі, тэхнікі і культуры служаць падрастаючым пакаленням толькі ва ўмовах справядлівага сацыяльнага ладу — сацыялізму.

У сацыялістычных краінах дзеці вырастаюць у абставінах усеагульнага клопату, у абставінах здзяйснення ленінскага лозунга: «Усё лепшае — дзецям!». Права вучыцца, атрымліваць прафесію, быць забяспечаным медыцынскай дапамогай, расці ў атмасферы раўнапраўя, міру — усё гэта неаддзяліма ад лёсу цэлых пакаленняў, якія выраслі ў гады Савецкай улады.



З мэтай стварэння найбольш спрыяльных умоў для выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту і аказання дапамогі сем'ям у краіне створана 120 тысяч дашкольных устаноў. У іх выхоўваецца больш як 13 мільёнаў дзяцей.

У краіне дзейнічае 4450 палацаў і дамоў піянераў, 1085 станцый і 1283 клубы юных тэхнікаў, 461 станцыя юных натуралістаў, 39 дзіцячых чыгуначных дарог, 500 клубаў юных пілотаў і касманаўтаў. Пры палацах культуры і клубах прафсаюзаў працуюць 26900 пакояў школьнікаў.

Мільёны дзяцей у капіталістычных і эканамічна адсталых краінах сёння не маюць элементарнага права на жыццё, паміраюць у раннім узросце ад голаду і недаядання. Яны растуць неадукаванымі і павінны працаваць, прычым нярэдка на становішчы рабоў. Дзеці з'яўляюцца ахвярамі вайны, каланіялізму, фашызму і расізму. Яны да цяперашняга часу пакутуюць з-за колеру скуры, сацыяльнага паходжання, рэлігіі...

Каб звярнуць увагу міжнароднай грамадскасці на неабходнасць абароны дзяцінства, XXXI Генеральная Асамблея ААН і абвясціла 1979 год Міжнародным годам дзіцяці.

**Н. ЖУКАВА.**

На здымку: сябры.

Фота А. Стадуба.

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

**Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.**

**20 снежня 1979 г.**

**Заказ № 2069 АТ 10984**

**220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.**

**ТЭЛЕФОН 22-07-19**

**В. а. рэдактара В. П. ВАРАБ'ЁЎ**